**Гарбачоў, М.** Трапныя стрэлы снайпера / М. Гарбачоў // Лепельскі край. — 2014. — 14 лют. — С. 4.

## ТРАПНЫЯ СТРЭЛЫ СНАЙПЕРА



***Ураджэнец вёскі Кабак Каменскага сельсавета Дзмітрый Аўтух патрапіў у Афганістан летам 1982 года адразу пасля курсаў маладога байца ў Тэрмезе. Служыў снайперам. На ўзбраенні была спецыяльная вінтоўка СВД з аптычным прыцэлам і вялікай паражальнай дальнасцю стральбы.***

– Суправаджаў калоны аўтамашын, якія перавозілі боепрыпасы, харчаванне і паліва, у тым ліку па горных дарогах-серпанцінах, характэрных для гэтай паўднёвай краіны, – расказвае Дзмітрый Сямёнавіч. – Аб тым, як складана было рухацца па камяністай, перасечанай мясцовасці, дзе на кожным кроку можна было натыкнуцца на засаду душманаў, сведчыць ужо толькі тое, што адлегласць усяго ў 100 кіламетраў нашы калоны аўтамашын звычайна пераадольвалі не хутчэй як за два дні. Наперадзе былі разведчыкі, якія папярэджвалі раптоўныя напады ворага. Сапёры абясшкоджвалі міны.

Частымі былі рэйды на верталётах у аддаленыя раёны, каб перахапіць і знішчыць асобныя вайсковыя групы душманаў. Як правіла, «вяртушкі» нават не садзіліся на зямлю з-за адсутнасці роўных пляцовак у горнай мясцовасці і магчымасці ператварыцца ў добрую, стацыянарную мішэнь для варожых «стынгераў». Верталёты толькі на невялікі час «завісалі», а салдаты выскоквалі на зямлю, па-пластунску адпаўзалі ўбок і адразу ж займалі зручную пазіцыю для стральбы па ворагу. Наогул, рэдка знаходзіўся на базе сваёй вайсковай часці – за ўвесь час службы ў Афганістане набярэцца ў агульнай колькасці не больш за сем – восем месяцаў.

– Ці сустракалі землякоў?

– У адной з баявых аперацый супраць душманаў удзельнічаў разам з аднавяскоўцам і сябрам Сяргеем Аўтухам. Доўгі час з ім перапісваўся па палявой пошце, абменьваўся навінамі ваеннай службы ў Афганістане. Потым Сяргей перастаў адказваць на мае пісьмы. І толькі праз пэўны час я даведаўся, што зямляк загінуў...

– Якія маеце баявыя ўзнагароды?

– Медаль «За адвагу».

– Як склаўся лёс у «пасляваенны» перыяд?

– Вярнуўся дадому ў маі 1984 года. Працаваў электрамантажнікам у Віцебску. У 1986 годзе ўладкаваўся токарам на Лепельскі завод шасцерань. На гэтым прадпрыемстве рабіў да 1999 года,

затым перайшоў працаваць токарам у філіял «Лепельскае дарожнае рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 202». Жонка Ларыса зараз працуе ў адным з банкаў Лепеля. Дачка Валянціна ўжо мае сваю сям'ю, падарыла нам дзвюх унучак – Дашу і Віку. Сын Ігар вучыцца на трэцім курсе камандна-інжынернага інстытута Міністэрства па надзвьгаайных сітуацыях ў Мінску.

**Мікалай Гарбачоў**

**На здымку:** Дзмітрый Аўтух

**Фота аўтара**